| Добрососедские отношения двух независимых государств | 32,5 |
| Союз независимых государств | 31,3 |
| Объединение в одно государство | 33,3 |
| **Табл. 3** | **Выбрали ответ, %** |
| Против объединения | 23,2 |
| За объединение | 56,2 |
| Не принял(а) бы участия в голосовании | 18,6 |

БЯСЬПЕКА

# БЕЗ ТАЯМНІЦ АД НАРОДУ

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

**Вакол новае рэдакцыі праекту канцэпцыі нацыянальнае бясьпекі ўжо трэці тыдзень не сьціхаюць чуткі. Яны ўзьнікаюць ва ўмовах абмежаванасьці якое- колечы інфармацыі аб зьмесьце гэтага дакумэнту. Грамадзкасьці вынікаў творчасьці трыццаці аднае дзяржаўнае ўстановы вырашылі не паказваць.**



Каб усё было чын чынам, грамадзкасьць патрабавала ад уладаў шырокага абмеркаваньня праекту. Беларуская Рада бясьпекі адгукнулася на гэта прэсканфэрэнцыяй. Да рэпартэраў даслалі намесьніка старшыні савбезу Вячаслава Князева. Ён, пэўне, яшчэ не пасьпеў звыкнуцца зь нядаўна атрыманай пасадай, таму з журналістамі трымаўся як тытулаваны прафэсар са студэнтамі першакурсьнікамі.

Зь ягонага пяцідзесяцёххвіліннага маналёгу, перасыпанага ўсьмешачкамі, можна было вылавіць, што Латыпаў разумее перавагі падзелу працы (калектыўная адказнасьць за стварэнне не такая балючая, як асабістая). Поле дзейнасьці акрэсьліў для ўсіх, пачынаючы ад міністэрстваў фінансаў ды адукацыі й заканчваючы камітэтамі па справах рэлігіяў ды нацыянальнасьцяў і памежных войскаў. Спыніўшыся ў гэтым кантэксце на КДБ, В. Князеў хіхікнуў асабліва выразна.

Апошні раз кірункі разьвіцьця нацыянальнае бясьпекі Беларусі ўзгадняліся ў 1995 годзе. Цяперашнее рэдагаваньне дакумэнту, па словах намесьніка старшыні Рады бясьпекі, выкліканае пераменамі ва ўнутранай палітыцы нашае краіны, а таксама зьнешнепалітычнае сытуацыі вакол яе. «*Гаворка ідзе аб істотнай эвалюцыі падыходаў эўрапейскіх краін і міжнародных арганізацыяў да інстытутаў, формаў і канцэпцыяў забеспячэньня бясьпекі*», – адзначыў В. Князеў.

Падараваўшы прысутным чарговую ўсьмешку, ён заклікаў іх пагадзіцца з тым, што ў новай гістарычнай рэчаіснасьці АБСЭ паказала сваю няздольнасьць нэйтралізоўваць буйныя канфлікты. Пасьля пайшлі абвінавачваньні краін усяе Эўропы. Яны, маўляў, вылучаець сваёй канчатковай мэтай стварэньне моцнага міждзяржаўнага утварэньня з элемэнтамі фэдэралізму, здольнага на практыцы стаць адным з усясьветных цэнтраў сілы.

Ён перасьцярог народ ад думкі, нібыта Беларусь прагрэсьўна мяняе погляд на нацыянальную бясьпеку «*ў адрыве ад іншых краін*». Наадварот, па яго словах, канцэптуальная рэвізыя сталася рэакцыяй «*на экспансыю NATO на ўсход...і зьмяненьні ў ваеннай дактрыне Расіі*».

Абмовіўшыся аб тым, што варта зьвяртаць увагу на міжнародныя прававыя нормы, В. Князеў падкрэсьліў прыярытэтную арыентаванасьць новае рэдакцыі канцэпцыі на беларускія нацыянальныя асаблівасьці гарантаваньня бясьпекі. Яны, у сваю чаргу, ніколі не супярэчаць інтарэсам расійскага боку. Таму ў Радзе бясьпекі падпісаньне шэрагу пагадненьняў з РФ ў ваенна-палітычнай сфэры й працяг дамоўленасьці аб калектыўнай бясьпецы ўважаецца за «*адэкватны крок*».

Пасьля ўсіх гэтых агульных слоў грамадзкасьць так і не вызначылася з тым, што ўяўляе для яе ўнутраную й зьнешнюю небясьпеку. Канкрэтна вызначаных ворагаў Беларусь, як высьветлілася, ня мае. Тое-сёе растлумачыць паспрабаваў старшыня камісіі па нацыянальнай бясьпецы ППНС Барыс Бікінін. Ён адразу зьвярнуў увагу на «*нехарошае*» NATO, але калі яго папрасілі распавесьці, чым жа альянс не дагадзіў Беларусі, ён разгубіўся. Урэшце, дэпутат выціснуў зь сябе: «*Мы ня супраць гэтага пашырэньня, але мэты мусяць адпавядаць першазадачам*».

А знутры свой спакой дзяржава падрывае сама. Асноўным клопатам савбезаўцаў сталіся харчовая й эканамічная бясьпека. Адным з накірункаў разьвіцьця зноў вызначылі забесьпячэньне правоў і свабод беларускіх грамадзян. З гэтым паранейшаму чакаюцца цяжкасьці. «*Нам неабходна, каб людзі маглі жыць па-сапраўднаму*», – зазначыў дэпутат. Пэўне, існаваньне ў межах Беларусі ўяўляецца яму напаўсном. Жахлівым. ■

ПАЛАТА № 2

# Ссумаваліся

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

**2 красавіка Круглую залю зноў агалосяць прыцішаным гулам дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Сэсыя будзе распачата своечасова, нягледзячы на тое, што шмат хто з прызначэнцаў выказаў жаданьне ўдзельнічаць ва ўрачыстасьцях з нагоды пятых угодак утварэньня Саюзнае дзяржавы ў Маскве.**

Павестку чарговае сэсыі ўжо зацьвердзілі. Перадусім будзе наладжаная фармальная працэдура выпраўленьня лічбы 97 на кругленькую 110. Пакуль давыбары ідуць па пляне, й праяўляць фальсыфікатарскі талент участкавым камісыям ніхто не замінае.

На працягу наступных трох месяцаў на абмеркаваньне прадстаўнікоў будуць прапанаваныя 4 кодэксы, 43 законапраекты, 18 міжнародных дамоўленасьцяў, 12 часовых лукашэнкавых дэкрэтаў ды 4 пастановы па пытаньнях прадстаўніцтва платнікаў у міжпарлямэнцкіх структурах.

Камісыя па нацыянальнай бясьпецы падрыхтавала да вясновых паседжаньняў толькі дзевяць законапраектаў. Бальшыня зь іх ўяўляе сабою перапісаныя начыста пакрэсьленыя варыянты даўніх праектаў. Закон аб ворганах фінансавых рассьледаваньняў некалі прышоўся не да спадобы Радзе рэспублікі. Паперку аб мабілізацыі пакрэсьліў нязгодны з фармулёўкамі прэзыдэнт. Дакумэнт аб аварыйна-выратавальных службах таксама давядзецца прыводзіць у адпаведнасьць з лукашэнкавым указам.

У некаторых паперах прафэсыйныя бюракраты блытаюцца самі. Закон аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, з-за якога рвалі яны галасавыя зьвязкі на мінулай сэсыі, страціў сваю актуальнасьць. Цяпер трэба прымаць пастанову, адмяняючую непатрэбную норму. З чацьвертае спробы спадзяюцца разьвязаць дылему: адбіраць ці не адбіраць зброю ў насельніцтва. Мінулым разам гэты закон палатнікі забракавалі. Яны не жадалі разьвітвацца зь іменнымі рэвальвэрамі.

Кабінэтныя гуртаваньні надакучылі дэпутатам горш як фасоль вэгітарыянцам. Прагнучы стасункаў, яны вылазяць з асобных пакойчыкаў і ладзяць прэсканфэрэнцыі, прадстаўляючы плён сваёй бярлогавай дзейнасьці. Камісыя па працы й сацыяльнай абароне вэтэранаў ды інвалідаў рэпрэзэнтавала свае шматпакутныя спробы зьмяніць закон «Аб вэтэранах». Спрэчкі вакол дадатковых 18106,2 мільёнаў BYB на паляпшэньне дабрабыту заслужаных дзеячаў краіны зацягнуліся.

Першымі камісыю ўзбаламуцілі дэпутаты са стажам М. Худая й А. Красуцкі. Дамовіўшыся з Палатай прадстаўнікоў, яны ня здолелі пераканаць у неабходнасьці сваіх паправак А. Лукашэнку. А. Красуцкі пасьпяшаўся адмовіцца ад сваіх патрабаваньняў, а М. Худая працягвае бараніць сваю пазыцыю. Лёс яе прапановы павінен вырашыцца гэтай вясной.

Вінаваты ў неадназначнай сытуацыі з грашыма для вэтэранаў будзе даваць дырэктывы ўжо 10 красавіка. У пляне паседжаньняў чакаюцца зьмены. Менавіта на гэтай сэсыі дэпутаты мусяць прыняць закон аб прызначэньні прэзыдэнцкіх выбараў. Праект даручалі распрацаваць камісыі на чале зь Міхаілам Сасонкам. Калі канчатковая рэдакцыя дакумэнту ўбачыць сьвет, невядома. Акрамя пытаньняў рэгляманту, гэты палатнік абцяжараны распрацоўкай праектаў па мясцовым самакіраваньні й дзяржаўным будаўніцтве. ■

2 АПРЕЛЯ

# Непонятный юбилей

*Окончание. Начало на стр. 1*

Процесс интеграции двух «*братских народов*» развивается по законам мыльной оперы. Это своеобразная «Санта-Барбара». Уже основательно подзабыт сюжетный застрел: «*непьюшчы*» президент Лукашенко в присутствии Ельцина, патриарха Алексия и прочего московского бомонда осушает хрустальный бокал водки и разбивает его о паркетный пол Кремля. А в Минске в это время проходит практически спонтанная тридцатитысячная демонстрация протеста. Даже милиция, стоящая в оцеплении, говорит, что «*нас продали за стакан водки*».

Постепенно происходит забраковка старых актеров, появляются новые, которые плавно входят в сюжет: на место ветерана Ельцина пришла новая восходящая звезда – Путин. Актеры второго плана также подвержены ротации. Уже никто не помнит первых авторов союзного договора – Шахрая, Пастухова. О необходимости интеграции теперь вещают Бородин, Рогозин, Игрунов.

Как и в сериале, интеграционный сюжет окончательно утрачивает видимый смысловой горизонт. В первые годы цели интеграции были предельно понятны и прозрачны. Союзными соглашениями создавался плацдарм, с которого Лукашенко собирался начать свой поход на Москву. Он и сам этого почти не скрывал.

Все помнят его знаменитое: «*Беларусь для меня – пройденный этап*». Сегодня недостижимость первоначальной цели очевидна, и Москва уже необходима Лукашенко именно для того, чтобы после президентских выборов Беларусь действительно не стала для него пройденным этапом. Без России, без ее информационной, финансовой помощи и, отчасти, без ее ядерной военной крыши Лукашенко, как Дракулу Брэма Стокера без гроба с землей из родной Трансильвании, – можно брать голыми руками и показывать детям. Тревожным сигналом для президента должно стать то, что, согласно данным соцопросов, 80 процентов его чиновников в тайне его ненавидят и мечтают о смене власти. Что уж говорить про остальных?

Тем не менее, после президентских выборов (в данном случае неважно, кто победит) не станет и этого смысла в нашей с Россией интеграционной игре. А дело без рациональной, здравой идеи в основании неизменно разваливается, оно лишено будущего. Лучше всего понимает это молодое поколение. Ему не пришлось пройти через советскую систему промывания мозгов, и поэтому у него не атрофировалось живое восприятие действительности. «*Малады фронт*», например, выступил с интересной инициативой: поскольку *День смеха* (известный во всем мире как *День дураков*) и «*День единения народов России и Беларуси*» в календаре стоят впритык друг к другу, их надо отмечать как один праздник. ■

ПАЛІТЫЧНЫ ПАРТРЭТ

# ШКЛОЎСКІЯ СТРАСЦІ

ВОЛЬГА ПАЎЛАВА

**Працяг. Пачатак у №№ 7–12**

**За Рыгоравіча**

– Усё, ...дзец Лукашэнку, – злосна сказала Ала Канаплёва. – Бы той верабей папаўся ён у каршуноўскія кіпцюры гэтай прайдзісветкі, і цяпер у тартарары паляціць і яго прэзідэнцтва, і аўтарытэт у цэлым...

Мы ішлі разам ад цэнтра горада, дзе сустрэліся, у накірунку Рыжкавічаў. Там, на паўдарозе, стаяў дом Канаплёвых. Мы яшчэ крыху пастаялі каля яго, каб дагаварыць. На двары кіпела лета 1994 года. І не буйной зелянінай і квеценню шчодрай на цеплыню пары, а палітычнымі страсцямі: Шклоўшчына ліхаманкава дабірала дадатковыя галасы для рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку. Штодня, з самай раніцы, пад камандай Уладзіміра Канаплёва ад універмага адпраўляліся па Магілёўшчыне некалькі аўтобусаў з добраахвотнікамі па збору подпісаў у падтрымку Лукашэнкі. У патрэбнай колькасці іх пастаўлялі ледзь не ўсе кіраўнікі райцэнтра і бліжэйшых гаспадарак, асабліва з саўгаса «Гарадзец». Перад выездам Уладзімір Канаплёў рабіў інструктажы наконт правільнасці запаўнення аркушаў, раздаваў «пустаграфікі», і аўтобусы набіралі хуткасць па абмоўленых маршрутах, каб ледзь не пад поўнач прывезці не чуючых ад стомы ног добраахвотнікаў у Шклоў.

– Я ледзь не абалдзела, калі сярод іншых убачыла Ларысу Маськову, – дзялілася Ала. – Ні сораму у бабы, ні сумлення. І дачку з сабой прыцягнула галасы за Сашу збіраць. Канаплёў толькі плячыма паціснуў, маўляў, калі хоча, няхай едзе, – у Магілёве ж не ведаюць, што яна каханка Лукашэнкі. Ну, у Магілёве – хай сабе, на лобе ў яе, сапраўды, нічога не напісана. А яна, разумееш, і па Шклову брындала з дачкой: адна – па адным баку вуліцы, другая – па другім. Здурэла зусім.

– А Лукашэнка як рэагуе?

Ала памаўчала, яе твар выразна адлюстроўваў адчай.

– А што яму? Не ўяўляе, напэўна, пікантнасці сітуацыі. І не слухаецца, калі адваджваеш ад Ларыскі. Усё роўна ляціць, быццам на крылах, да яе, і машыну не хавае – усю ноч стаіць пад яе вокнамі. І ў магазін да яе наведваецца. Хоць бы канспірацыю захоўваў... Калі раней ты з ёй якшаўся, дык чорт з табой. А цяпер, калі ў такую гульню ўвязаўся... Не, гэтая сцерва можа ўсё сарваць, – з адчаем кідала ў паветраную прастору Ала.

– Дык можа ён яе кахае? – ужо чыста па-жаночаму дапытвалася я.

– Халера іх ведае, – адказала Ала. Толькі ж людзей смяшыць навошта? Узяў бы да пераходзіў да Ларыскі.

– Ну і...

– Быццам сама не ведаеш. Галя ж не ідзе на скасаванне шлюбу. І Валодзя з ёй па Сашавай просьбе колькі гутарыў – ні ў якую.

– Чаму тады сам не падасць заяву ў нарсуд?

– Таму што імідж свой не хоча псаваць. Адна справа, што жонка з ім разводзіцца, і зусім іншая, калі ён з ёй. Вэрхал тады ўздымецца на ўсю рэспубліку.

– Ну і хітрэц! – усклікнула я. – І рыбку хоча з'есці, і костачкай не падавіцца.

– Ай, хопіць пра гэта, – апамяталася Ала. – Няхай самі расхлёбваюць кашу, якую заварылі.

Відаць, у парыве непажаданых эмоцый Ала Канаплёва выказала зусім не прызначанае маім вушам. І цяпер шкадавала сама. Я чытала на яе твары бег тых эмоцый, роўна як і пошук нейтралізацыі пададзенай інфармацыі пра магчымага прэзідэнта. І Ала спынілася на бяспройгрышным варыянце: засяродзіла ўвагу на дзецях, плаўна перайшоўшы на маіх, быццам бы нічога для яе больш важнага не існуе, чым іх жыццеўладкаванне. Я зрабіла выгляд, што заглынула нажыву са скваплівасцю шчупака. Яшчэ некалькі хвілін яна пагаварыла і, пераканаўшыся, што дасягнула сваёй мэты, паспяшалася развітацца.

Дзякуй табе, Ала. Ты нават і ўсвядоміць не можаш, як паўплывала на вынік маёй барацьбы! Як не дзіўна, але менавіта гэтымі выказваннямі ты шырэй раскрыла мне вочы на Аляксандра Лукашэнку. Я зразумела: ён звычайны. І нават такі ж бабнік, як і многія іншыя мужыкі.

І я ліхаманкава стала шукаць шляхі развянчання куміра мільёнаў, вырашыўшы абнародаваць факты з яго біяграфіі. Тады, летам 1994 года, я спачатку мела намер іх абнародаваць, даслаўшы ў якую-небудзь рэспубліканскую газету. Але потым схамянулася: сама журналіст, і сумны лёс такіх матэрыялаў мне знаёмы да драбніц... Вось каб знайсці пуп нашай зямлі беларускае, ускараскацца на яго вышыню ды крыкнуць на ўсю моц: «Людзі, не галасуйце за Лукашэнку, бо падманецеся!» Толькі хто пачуе той слабы чалавечы голас у моры страсцей, якое разгайдалі апантаныя ды прагныя да ўлады палітыкі.

***

Сваю першую пасля тае размовы раніцу я пачала з тэлефону. Першай патэлефанавала Т. М. Анішчанцы ў Горкі.

– Гэта ты, Волечка? – азвалася яна. – Ну як там жывецца табе, як дзеткі?

– Якія табе дзеткі, – зусім не дыпламатычна абарвала яе я. – Ты лепш скажы, за каго будзеш галасаваць?

– Даліся табе гэтыя выбары. Я ніколі на іх не хадзіла і не пайду. За каго Віктар (муж) прагаласуе, за таго і ладна.

– Вось з-за такіх, як ты, і будзем потым пакутваць, – эмацыянальна зашыпела я ў трубку. – Ты ж зразумей: за каго прагаласуем, такое і жыццё будзе.

– Ладненька. Прагаласуем усёй сям'ёй за Лукашэнку. Ён твой сусед: ты сапраўды ведаеш яго лепш.

– Менавіта таму я і прашу цябе ні ў якім разе не галасаваць за яго.

Я не бачыла твару гэтай жанчыны, але, мяркуючы па занадта зацягнутай паўзе, ён, напэўна, быў здзіўлены.

–Я памылілася, – сказала я ёй і хутка развіталася.

Набрала ўслед нумар Т. М. Рынкевіч, таксама з Горак. Я яе завербавала падчас наведвання Беларускай сельгасакадэміі.

– Як добра, што вы пазванілі, – сказала яна. – Я абышла амаль усе шматпавярхоўкі ў акадэмгарадку, запоўніла ўсе вашы аркушыкі. Так што можаце прыязджаць і забіраць іх. Людзі распытваюць пра Лукашэнку, думаючы, што я яго ведаю. А на самай справе адно ведаю: толькі Лукашэнка станоўча можа паўплываць на лёс нашай Беларусі. Вы чуеце мяне, Вольга Міхайлаўна? Што вы маўчыце?

– Чую, – падаўлена адказала я. Эх, калі б мы размаўлялі ўжывую, я, напэўна, змагла б ёй усё патлумачыць і быць зразуметай. Але яна перабіла мае блытаныя тлумачэнні:

– Я не мяняю свае светапогляды, як пальчаткі. У мяне яны, у адрозненні ад вашых, стабільныя. А вам параю: больш адказнай будзьце за свае словы і ўчынкі.

Знясілена, я паклала трубку на стол. Яна доўга яшчэ даймала караткімі гудкамі, што быццам уколы сумлення шпілялі ў мозг.

***Працяг у наступным нумары***

АНОНС

# Капкан для душегуба

**Под таким названием вышла в свет документальная повесть Анатолия Бруцкого, в которой описывается печально известное «Витебское дело».**

За 15 лет полоцкий маньяк Геннадий Михасевич, по его признанию, убил 37 женщин на территории 8 районов Витебской области, а также в Витебске и Полоцке. В ходе расследования уголовного дела было установлено, что за целый ряд этих убийств правоохранительные органы задерживали невиновных людей и разными способами добивались от них признания.

Всего за убийства, которые они не совершали, было осуждено 12 человек, один из них – Н. Тереня – приговорен к высшей мере наказания. Трое полностью отбыли длительные сроки лишения свободы (от 9 до 15 лет). Кроме того, два человека задерживались прокуратурой на длительные сроки, а один направлен в психиатрическую больницу на принудительное лечение. В конце концов, осенью 1986 года Михасевича задержали, в мае следующего года суд приговорил его к высшей мере наказания, 19 января 1988 года приговор приведен в исполнение.

Мало кто знает, что отчасти заслуга в поимке маньяка принадлежит и спикеру Верховного Совета 12-го созыва Мечеславу Грибу, который в феврале 1985 года был назначен начальником управления внутренних дел Витебского облисполкома.

В книге использованы документальные свидетельства и воспоминания непосредственных участников тех событий. Показания самого Михасевича, рассказы родственников его жертв, воспоминания оперативных работников, занимавшихся расследованием дела и поимкой преступника, материалы дела.

Свою первую жертву Михасевич задушил в мае 1971 года. Спустя 15 лет он признался следствию: «*Это было давно... я задушил девушку под Полоцком... недалеко от Экимани... встретил ее в темное время... Это было в мае. Девушка была загорелой... Эту девушку я задушил прямо на дороге. Потом оттащил в сторону... там были яблони...*» Позднее он дополнит свой рассказ: «*Тогда у меня было тяжелое состояние из-за того, что я порвал со своей девушкой Леной... Я напал на девушку прямо на дороге и стал душить за горло обеими руками... Она пыталась вырваться, махала руками, но крикнуть не успела, я засунул ей в рот платок, чтобы после удавления она не отдышалась и не пришла в себя*».




ПАТЭНЦЫЯЛ

# Крызыс крэатыву

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

**Любіць беларускае кіраўніцтва лашчыць свой народ прыметнікамі *«разумны»* й *«кемлівы»*. Асабліва часта аб высокім патэнцыяле мясцовых навукоўцаў згадваюць перад прэзыдэнцкімі выбарамі. То іх асабіста Лукашэнка зьбірае для прылюднага выказваньня падзякі, то Ярмошын раздаваць мэдалі падахвочваецца.**

Тыя, хто аддае перавагу не прэзыдэнцкім граматам, а рэальнаму дабрабыту, ліняюць з радзімы, як сьмяротнікі з казематаў. Едуць туды, дзе іх залатыя галовы будуць ацэненыя ня менш як шасьцёхзначным лікам на асабістым рахунку. Дзяліцца сваімі геніяльнымі ідэямі, як гуманітарнай дапамогай, на радзіме мала хто жадае.

Дзяржаўныя ўзнагароды дастаюцца пераважна безь пяцёх хвілін пэнсыянэрам. У бальшыні выпадкаў нічога надзвычайнага ў сваёй галіне яны за доўгія гады практыкі не стварылі. Падставай прышпіліць штампаваную мэталічную бляшку робіцца ўзорная біяграфія й рэпутацыя адданага працаўніка. Начальства складае пляны, дзеячы іх выконваюць. Прыжываюцца на рыбным месцы – трапляюць у сьпісы заслужаных ды ганаровых.

У Беларусі застаецца народ дзьвюх катэгорыяў. Першая лучыць прынцыповых неэмігрантаў. Так і ня страціўшы максымалізму, яны вераць, што іхняе моцы хопіць, каб здабыць навуковую славу для роднае краіны. Другая, на шмат большая, складаецца з тых, хто ня мае чаго прапанаваць замежным інвэстарам. Псэўданавукоўцы актыўна ствараюць уражаньне бурлівае дзейнасьці ў айчынных НДІ й акадэміях, намагаючыся вытрасьці як мага больш грошай калі не з ураду, дык са спажыўцоў сваіх распрацовак.

Прадстаўнікі творчых па вызначэньні прафэсіяў часта не напружваюць сябе гэтай самай творчасьцю. Па-новаму яны здольныя спалучаць толькі ўжо гатовыя арыгінальныя прыдумкі сваіх, найчасьцей замежных, папярэднікаў. Практыка прафанатарства ў Беларусі дасягнуў занябёсных вышынь. Амплюа экспэрта вымагае ад яго носьбіта зьмяшчаць час ад часу канцэптуальныя артыкулы ў тоўстых часопісах для адмыслоўцаў. Матар'ялы, нягледзячы на беспрабудны сон якое-колечы сьвежае думкі, у друку зьяўляюцца.

Ужо пасьля высьвятляецца, што нехта на захадзе год дзесяць таму казаў тое самае, але лепш. Айчынныя перапісчыкі не ўважаюць за неабходнасьць спасылацца на арыгінальных аўтараў. Яны спадзяюцца, што ніхто зь мясцовае інтэлігенцыі іх імёнаў ніколі ня чуў, а арыгінальных прац нават не праглядаў.

У краіне зь невылечна хворай экане́мікай асабліва пакутуе эканамічная думка. Замежнікам раяць зьвяртацца па грунтоўную аналітыку па гэтай тэматыцы да мясцовых аўтарытэтаў. Між тым, некаторыя зь іх ні за якія грошы сьвету ня здольны выдаць замест вінегрэту з чужых канцэпцыяў некалькі старонак якаснага аўтарскага тэксту. Аб гэтым ня раз казалі перакладчыкі. Ім, гаротным, даручаюць знаёміць з крэатывам беларускіх адмыслоўцаў замежныя навуковыя колы. Вось і ламай галаву над тым, як патлумачыць міжнароднаму аўтарытэту, што новы твор, народжаны ў Беларусі, не перапісаны зь яго апошняе манаграфіі.

Калі псэўданавукоўцы бяруцца за стварэньне ўласных манаграфій ды падручнікаў, іх крэатыўныя высілкі абмяжоўваюцца плягіятам. Сябры й калегі спадарыні X раяць сваім студэнтам карыстацца яе «*Граматыкай ангельскае мовы*». Двухтамовае выданьне ёсьць прадуктам найгрубейшага перадзіраньня ў паважаных замежных лінгвістаў. Ніводная з крыніц натхнёнага перакатваньня пісьменьніцай у бібліяграфіі не пазначаецца.

Гаворку можна весьці аб парушэньні аўтарскіх правоў. Але беларускія псэўданавукоўцы не ўяўляюць, як можна інакш пабудаваць працу. Калі на катэдры замежных моў у БДУ абмяркоўвалі стварэньне новага падручніка, то выкладчыкі проста казалі, што кавалак пра назоўнік яны возьмуць у М. Свона, а прыклады для часоў дзеяслова – у Л. Аляксандра ці Р. Мэрфі. Паважаныя знаўцы ангельскае ня здольныя прыдумаць сваіх прыкладаў сказу з *Present Indefinite*. Для даведкі: такое заданьне прапануюць выконваць вучням агульнаадукацыйнае школы, якія вывучаюць новы прадмет толькі першы год.

Для таго, каб скласьці англа-беларускі слоўнік, вынаходлівым беларусам не абавязкова ведаць дзьве гэтыя мовы. Аўтарскі ганарар можна атрымаць, спалучыўшы дадзеныя ўжо існуючых англа-рускага й руска-беларускага слоўнікаў. Гэтым і займаюцца людзі, для якіх адзінай вядомай мовай ёсьць вялікая й магутная. Пакутуюць ад гэтага студэнты, што давяраюць высілкам беларускіх перапісчыкаў.

Пачынаецца ўсё яшчэ ад школы, калі вучням дазваляюць здаваць у якасьці рэфэратаў перапісаныя ад рукі ці набраныя на кампутары (а часам проста адсканаваныя) артыкулы з энцыкляпэдыяй. У дзіцячай сьвядомасьці ўтвараецца непахіснае перакананьне ў тым, што калі нехта ўжо напісаў нешта аб прадмеце іх працы, дык новага выдумляць ня трэба. Напісанае ёсьць у іх уяўленьні абсалютнай ісьцінай. Школьнікаў ня вучаць сумнявацца.

Нават сачыненьні, якія можа ствараць толькі асоба з крэатыўнымі здольнасьцямі, можна перапісваць з адмысловых зборнікаў. Гэта, праўда, забаронены шмат якімі выкладчыкамі прыём, але карыстацца крытычнымі даведнікамі настаўніцтва прымушае. Самі выкладчыкі нават не задумваюцца, што можна працаваць інакш. Іх таксама вучылі па такой сыстэме: ня думаць і аналізаваць, а запамінаць гатовыя тэорыі, правілы й догмы. Навука для іх ёсьць нечым статычным.

Вышэйшая школа таксама не прывучае будучых адмыслоўцаў да самастойнасьці. Тым, хто ня ўмее вышукваць рэфэраты й курсавыя праз Інтэрнэт, за пэўную суму дапамогуць апошнія сьветлыя галовы Беларусі.

Выпускнікі ўладкоўваюцца на працу... У канструктарскіх аддзелах дзяржаўных прадпрыемстваў рацыяналізатарскіх прапаноў чакаюць ад усіх інжэнэраў. Рэальна ж на вынаходніцтвы і дэталёвую распрацоўку праектаў здольныя адзінкі. Астатніх супрацоўнікаў трымаюць для ўкамплектаванасьці штату. За кошт высілкаў галавастых канструктараў выконваюцца не адмененыя дагэтуль пляны.

Прэміямі за працоўныя посьпехі народ, здольны на крэатыў, мусіць дзяліцца ня толькі з начальствам і начальствам начальства, але й калегамі па аддзеле. Інакш дадатковае капейкі наагул ня будзе. Калі кіраўнікі ператвараюцца ў пэнсыянэраў, крэатыўным асобам даводзіцца займаць іх месца, бо больш няма каму. Адміністратыўныя абавязкі замінаюць рэалізацыі даўно задуманых, але недапрацаваных праектаў.

Здольнасьць выдаваць якаснае ўвасабленьне сваіх задумак страцілі й беларускія заканатворцы. Яны найчасьцей кампілююць, а часам і адкрыта перадзіраюць праекты сваіх пастаноў з дакумэнтаў суседніх краін (збольшага ў расіян). Свайго розуму для працы па спэцыяльнасьці ў іх не стае. Апошні грамадзянскі кодэкс на 95 адсоткаў паўтарае адпаведнае расійскае заканадаўства. Яно б было нішто, на ўсходзе ёсьць галавастыя адмыслоўцы па ўнармаваньні і ўрэгуляваньні грамадзкіх стасункаў.

Але беларускія заканатворцы паспрабавалі для задавальненьня пачуцьця ўласнае годнасьці астатнія пяць адсоткаў кодэксу прыдумаць самастойна. Гэтая частка дакумэнту рэзка выбіваецца з асноўнага тэксту й зьбірае ў сабе ўсе хібы. Адным з вычварэньняў мясцовага чыноўніцтва сталася правіла прыводзіць умовы зацьверджаных кантрактаў у адпаведнасьць са зьмененымі нарматывамі. Такім чынам атрымліваецца, што заключанае на выгадных умовах пагадненьне можа прынесьці страты, калі некаму прыйдзе на розум зьмяніць літару закону. ■

СПОРТОБЗОР

## Беларусь – лишь наблюдатель

В канадском Ванкувере прошел чемпионат мира по фигурному катанию, где сборная Беларуси могла рассчитывать на успешное катание. Основные надежды связывались с Юлией Солдатовой и Сергеем Давыдовым. Однако уже после первых выступлений стало ясно, что надежды так надеждами и останутся. В итоге Юлия заняла двадцатую строчку итогового протокола, а Сергей оказался лишь двадцать девятым. Что же касается нашей танцевальной пары, то Алиса Де Карбоннел и Александр Малков показали лишь тридцатый результат (среди тридцати пяти пар).

В целом чемпионат показал, что уровень спортсменов значительно вырос, и уже тяжело кого-то заранее отнести к фаворитам либо аутсайдерам. Качество выступлений ведущих фигуристов настолько выросло, что определять лучшего порой приходится среди шестисеми равных. Задача это сложная, так что несогласные с мнением судей всегда найдутся.

Тем не менее, сильнейшие были определены. Первыми разыграли медали спортивные пары, где первенствовали хозяева чемпионата: Дж. Сейл и Д. Пеллетье. Немного уступили им российский дуэт Е. Бережная и А. Сихурулидзе и китайцы К. Чень и Х. Жао. В одиночном разряде у женщин вне конкуренции оказалась американка М. Кван, обошедшая россиянку И. Слуцкую и свою соотечественницу С. Хьюз. У мужчин выше всяких похвал выступили россияне, но в итоге Е. Плющенко обошел А. Ягудина. Третьим был Т. Элдридж (США). Среди танцевальных пар призовые места распределились следующим образом: Б. Фузар-Поли/М. Маргальо (Италия), М. Анисина/Г. Пейзера (Франция), М. Лобачева/И. Авербух (Россия).

## Первое золото!

2 часа 35 минут 51.9 секунд потребовалось одному из участников 60-ти километровой гонки в заснеженном финском городке Куопио для того, чтобы стать на пару дней национальным героем. Он смог не только оказать достойное сопротивление таким «монстрам» лыжных гонок, как Мюллег, Зоммерфельд, Крянин, но и, на удивление большинства зрителей, и специалистов вырвал победу на последних метрах дистанции. Радуйтесь! Победителем оказался... белорус! Впервые в истории золотую медаль за победу в соревнованиях подобного рода получил наш соотечественник. Пусть замолчат пессимисты, заявляющие, что не видать нам первого места, если бы все фавориты вышли на трассу. Пускай отказались от старта Элофсон, Хьельмесет, Альсгорд, зато участвовал в гонке один из лучших норвежских биатлонистов Фроде Андерсен, который задавал темп большую половину дистанции.

Итак, обладателем золотой медали стал белорус Сергей Долидович. Менее двух секунд проиграл ему итальянец Пиллер-Коттрер. Тому в свою очередь четыре с половиной секунды уступил австриец Ботвинов. Лучшим из россиян стал Алексей Прокуроров, приехавший пятым. В десятке оказался еще один представитель нашей страны, Александр Санников, проигравший триумфатору менее минуты и занявший девятое место. После отдыха Сергей в разговоре с журналистами заявил, что итальянец уже имел в своей карьере несколько побед, а он нет. Следовательно, была выше мотивация и как итог – первая в жизни Сергея Долидовича и первая в истории белорусского лыжного спорта медаль высшей пробы. Значит, могут, если постараются. Возможно, в скором времени они также, как и наши стреляющие лыжники, станут радовать нас своими успешными выступлениями. Поживем – увидим.

## Европа выходит на финишную прямую

Не так давно мы с нетерпением ждали начала ведущих европейских чемпионатов. Еще свежи воспоминания о первых встречах, а оказывается, что две трети матчей в большинстве серий, лиг и дивизионов уже сыграно.

Титул самого неожиданного первенства подтвердила Франция. Если в начале сезона лидерство отдавалось таким клубам, как «Марсель», «ПСЖ», «Бордо» и «Монако», то на деле лишь жирондинцы доказали состоятельность этих пророчеств, остальные клубы прочно укрепились в нижней части турнирной таблицы. На ведущих ролях оказались новые команды: «Лилль», «Нант», «Лион» и «Седан». Первые две из них набрали по 53 очка и теперь имеют четырехочковое преимущество над «Лионом» и «Бордо». Расположившийся на пятой строчке «Седан» уступает лидерам шесть очков.

Оставшиеся семь туров решат, кому же достанется титул чемпиона в этом году и кто покинет высшую лигу. Одним из таких клубов наверняка станет «Страсбур», и кто-то из пары «Тулуза» – «Сент-Этьен». Однако если последние отсудят отобранные у них семь очков, то шансы на вылет «Тулузы» сильно вырастут.

Уже давно отпал вопрос о победителе в английской премьер-лиге. «Манчестер Юнайтед» на голову сильней остальных дружин на туманном Альбионе. «Арсеналу» стоит позаботится о своем втором месте, так как «Ливерпуль», имеющий на две игры меньше, отстает всего лишь на восемь очков. За третье место могут реально побороться «Ипсвич», «Сандерленд», «Лидс» и «Лестер». Покинут высшую лигу «Бредфорд», «Ковентри» или «Манчестер Сити» – оставшиеся восемь кругов покажут.

Десять туров осталось провести командам в бундеслиге. За медали смогут вести борьбу, наверное, только шесть клубов. «Бавария» опережает своих ближайших преследователей «Байер» и «Кайзерслаутерн» на три очка. «Боруссия» уступает четыре, а «Шальке-04» и «Герта» по шесть очков. «Бохум» в следующем сезоне будет играть во второй лиге, а пару ему составит либо «Унтерхахинг», либо «Штутгарт».

В Испании, как и ожидалось, медали разыграет между собой «великая четверка». «Реал», «Депортиво», «Валенсия» и «Барселона» отстают друг от друга соответственно на пять, два и три очка. Однако матчи Лиги чемпионов кубка УЕФА могут существенно изменить положение. Кто-то из четверки «Расинг», «Осасуна», «Реал» С-С. и «Нумансия» в этом году покинет высшую лигу.

В Италии неоспоримое преимущество имеет «Рома», отрыв от «Ювентуса» составляет семь очков, который, в свою очередь, опережает «Лацио» на два. Скорее всего, именно эти команды поведут борьбу за серебро.

Подготовил СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

АСОБА

# КАСЯ КАМОЦКАЯ: КАБ УСЁ ІШЛО НАТУРАЛЬНА

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

**Некалькі месяцаў таму ў менскім музычным асяроддзі хадзілі ўпартыя чуткі пра тое, што гурт «Новае Неба» развалiўся. Але нечакана каманда Касі Камоцкай стрэліла на прэзэнтацыі у «Акварыюме» БМАшнай зборкі «Мора каханьня», потым быў канцэрт на Ўкраіне падчас акцыі «Геть Кучьму!».**

24 сакавіка каманда зноў выступіла ў Менску. Што ж зараз уяўляе сабой «Новае неба», чым яно жыве, якія зьмены адбыліся за апошнія часы? З такога пытаньня й пачалася нашая размова з **КАСЯЙ КАМОЦКАЙ.**

– Мы іграем старую праграму і зараз ня пішам новай, таму што стала нецікава працаваць далей у такім самым стылі. Па цяжкасьці музыкі «дойдзена да кропкі», цяпер трэба штосьці мяняць. Фактычна, гэта перапынак у стварэньні новага. Бо я папросту трошку разгублена, ня ведаю...

*– Але ўсё будзе працягвацца.* Я думаю, што будзе. Проста іншая справа, што мне нецікава іграць для падлеткаў, я шчыра кажу. I я не разумею *N.R.M.* Дзядзькі, якім па 35 гадоў, іграюць для дванаццігадовых і скачуць па сцэне. Не, гэта, канешне, добра, гэта павышае фізічную падрыхтоўку музыкаў – доўга пражывуць. Але мне, напрыклад, нецікава. Я зараз па раздарожжы, таму што не ведаю, як знайсьці іншую публіку і проста іншыя песьні. Я хачу сказаць, што публіка на канцэртах вельмі зьмянілася. Яна папшырылася сацыяльна, і, з другога боку, яна й люмпэнізавалася.

Ёсьць і іншая публіка, ёсьць, канешне ж. І для іх трэба мяняць музыку. Таму, што гэтая музыка, дзе за шквалам гітарным не чутна словаў... Я сама б на такія канцэрты не пайшла. Жартую, канешне. Але на *N.R.M.* і праўда б не пайшла. Таму што проста як паглядзіш вакол, хто прыйшоў...

*– Слава Корань сышоў з гурта. А зараз хто з вамі іграе?*

– Зараз іграе Надзёжкін, гэта гітарыст «ТОРНАДО». І ён адкрыты на абсалютна іншую музыку – на баладную. Яму, напэўна, таксама за гэтыя гады надакучыла «джыжжаць». Астатні склад той самы застаўся: Паўловіч (бас-гітара) й Ганс (бубны).

*– Вяртаючыся да вашага раздарожжа. У якім накірунку больш хацелася б рухацца зараз? Што бліжэй – эмоцыі ў творчасьці ці інтэлект?*

– Я лічу, што ўся творчасьць, якая пабудаваная на інтэлекце – проста сумная. Для мяне. Таму, канешне ж, эмоцыі. І таму хацелася б мне асабіста пасьпяваць лірычных песьняў. Зусім лірычных, гэта нармальна. Але з такой паэзыяй чамусьці яшчэ складаней. Усё, што прыносяць, усё, што я чытаю... Усе пішуць пра рэвалюцыю, альбо смур, альбо нешта такое з разраду інтэлектуальный накручанасьці. І ўсё!

А зараз хацелася б больш пра каханьне, чым пра змаганьне. Хаця б таму, што я думаю, зараз ёсьць шмат гуртоў, якія могуць сьпяваць і будуць сьпяваць у нашыя цяжкія часы пра змаганьне.

Разумееш, галоўнае, што перада мной стаіць, – я хачу зьмяніць сваю публіку. Хачу, каб зь людзьмі, якія прыходзяць на нашыя канцэрты, у нас быў нейкі дыялёг. А змаганьне – гэта мітынговасьць, гэтая пляцовасьць, яна не падразумявае ніякага дыялёгу...

*– Ці не лічыце вы тады, што каханьне – больш эфэктыўны спосаб зьмены сьвету, чым змаганьне?*

– Безумоўна. Іншая рэч, што каханьне – вельмі цяжкая праца, куды больш цяжкая, чым вырваць штосьці з чужых рук, чым злосьць.

Я не заклікаю да *«непротивления злу насилием»*, я супраць гэтага талстоўства. Але адмоўная энэргія ня можа нараджаць станоўчы вынік. Ня можа, на жаль. Нават той жа Лукашэнка. Можа, ён і хоча зрабіць штосьці, але гэта адмоўная энэргія, якая ад яго прэ, яна ўсё разбурае. І мы становімся такімі.

Ведаеш, калісьці напісалі ў *Gazece Wyborczaj* пра «Народны Альбом», які мы прадстаўлялі, што гэта антылукашэнкавая рокопэра. І на наступны дзень у гэтай жа газэце зьявіўся яшчэ больш артыкул, ёсьць такі Роберт Ляшчынскі, музычны крытык, вядомы там, які адказаў, што такое толькі дурань мог напісаць, што яна антылукашэнкавая толькі таму, што там няма месца Лукашэнку. І гэта самы ўдалы, на мой погляд, на сёньняшні дзень прадукт, які выдала беларуская тусоўка.

*– Дарэчы, потым беларускую тусоўку трохі закліліна на калядарацыях. Вы ня бралі ўдзел у наступных праектах з творчых прычын?*

– Не, з прынцыповых. Я лічу, што гэта поўная глупства. Калі б такі альбом, як *«Я нарадзіўся тут»*, выйшаў 15 гадоў таму, для мяне б гэта была настольная касэта. Сёньня я сэнсу гэтага не разумею.

З калядным альбомам... была спачатку задума зрабіць проста калядную касэту. Я згадзілася. Але так, як гэта было зроблена, калі спадаром Сушам былі раздадзеныя касэты і тэксты... Маўляў, трэба зрабіць вось такія, такія песьні, таму што ў нас няма беларускіх калядак. Усё гэта, канешне ж, зроблена няшчыра. І шчырая там толькі адна песьня Памідорава, хаця яна абсалютна не ў канцэпцыі. Але яна шчырая. Таму што гэта ягоная песьня. А астатняе – *«зьвіняць званочкі, зьвіняць...»* Мне, напрыклад, ня хочацца ўдзельнічаць у сумнеўных праектах. Вельмі хочацца браць удзел у сумесных праектах. Але ў такіх сумнеўных – гэта абсалютнае глупства.

*– І яшчэ адно пытаньне. Мы, як шмат хто лічыць, знаходзімся ў пераломным годзе, на носе прэзыдэнцкія выбары. Не спытацца ў Касі Камоцкай аб яе поглядах на гэты конт – значыць пакінуць інтэрвію нясконьчаным.*

– На мой погляд, самым лагічным, як бы гэта дзіка не гучала з маіх вуснаў, было б пакінуць на пасту прэзыдэнцкім Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку. Каб усё ішло натуральным чынам. Каб ён ужо дабіў людзей да таго стану, калі яны ўсё зразумеюць, калі яны павераць у дэмакратычныя каштоўнасьці і рынкавую эканоміку. Бо калі прыйдзе любы дэмакрат да ўлады, гэты народ учыніць сабатаж, вось і ўсё. І гэта яшчэ раз можа невядома ў што ператварыцца. Але калі я пайду галасаваць, то сэрцам усё роўна, хаця логікай я ўсё разумею, канешне, прагаласую за аб'ядкую апазіцыю.

Але калі падумаць пра тое, што я гісторык па адукацыі, прагледзець гістарычны вопыт і параўнаць нават з той жа ўкраінскай сытуацыяй. Я выступала на акцыі «Геть Кучму», на Крэшчатыку. Я выйшла, там было 50 тысяч народу. *«Беларусы, у іх аналагічныя праблемы»*. Не, кажу, вы не разумееце, якія бываюць праблемы, вы проста не можаце зразумець, што робіцца з моваю, што робіцца з прэсай, не дай Бог вам такіх праблемаў, як у нас. На што з натоўпа крычаць. *«Ну што вы, у вас такі харошы прэзыдэнт»*.

Лукашэнку выбралі б і ў Расеі, і ў Беларусі, і на Ўкраіне. Такую асобу выбралі б паўсюль на постсавецкай прасторы. Я кажу пра ўзровень разьвіцьця палітычнай культуры гэтых постсавецкіх народаў. Вось і ўсё. Хто б ні перамог, будзе горш, і хай лепей за гэта адкажа Лукашэнка. Хай усё ідзе натуральным чынам, і асноўная маса зразумее, што да чаго. Пакуль гэтага ня будзе, ня зьменіцца нічога.

■

ТЕАТР

# Глазами женщины

ТАТЬЯНА ПОЛЯКОВА

**В театре киноактера — премьера. Пьесу с интригующим названием «Поле битвы» написала Светлана Бартохова. А воплотили на сцене ее женское творчество двое мужчин — Александр Беспалый и Владимир Грицевский.**

В двух составах спектакля участвуют известные актеры: Анатолий Гурьев, оба Петра Юрченкова – младший и старший, Ирина Нарбекова, Елена Одинцова, Валерия Арланова, Юлия Полубинская, Анатолий Кот, Ольга Сизова и Юлия Шпилевская.

По обилию женских персонажей, читатель, вероятно, догадался, что ему не покажут фрагменты военных сражений или раздумья полководцев в преддверии решающего – иду на вы! Ничего подобного, поле битвы – обычная квартира, где живет типичная семья.

*«Так мы увидим жуткие семейные конфликты!* – воскликнет потенциальный зритель. – *Уж я знаю, что в квартирных стенах можно так затерзать и затравить друг друга, хуже, чем на поле брани!»*

Но конфликты в пьесе отмечены чувством юмора и меры. Это сдобренный изрядной иронией женский взгляд на взаимоотношения полов. Мягкий спор с патриархальными традициями, согласно которым мужчине можно все, а женщине полагается быть удобной, терпеливой, тактичной... И несколько подслеповатой, чтобы не слишком замечать, как ее благоверный ходит к соседке по лестничной площадке. И немного глуховатой, чтобы не слышать, как под видом таинственного делового партнера отцу семейства звонит очередная, уже надоевшая, пассия.

Мы видим два поколения семьи Красовских. Импозантного, склонного к супружеским изменам отца, интеллигентную и еще привлекательную даму – его супругу. Сына-студента, который все видит, все понимает и делает очень интересные выводы. И, наконец, замужнюю дочь, вовсе нежелающую быть такой же терпеливой и такой выдержанной, как ее сорокалетняя мать.

